**Документы, необходимые для участия в аукционе:**

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.
2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.
3. Гражданином — копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

представителем гражданина — нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан — документ, удостоверяющий личность.

## Занатоўкі мастака



### ДЗЯРГАЙ І ЛІРЫКА

«Адведаем старога Дзяргая?» — пытаецца бацька. «Адведаем». Мы заходзім у пракураную аднапакаёўку, што ў трэцім пад'ездзе на першым паверсе. Паэт Дзяргай жыве ў нашым чатырохпавярховым белацагляным доме, які стаіць на рагу Коласа і Ламаносава. Дзяргай любіць сінядымны тытунь і густа-бурштынавую гарбату. Ён робіць мне паўлітровы моцнай і салодкай, як сочыва, гарбаты-дзяргаеўкі. Значна пазней я даведаюся, што бацька паэта ў дваццатых гадах мінулага стагоддзя меў у Мінску ўласную сталоўку, у якой закусвалі нават Купала з Коласам. А тады, стоячы каля этажэркі з беларускімі кнігамі, я спажываў гарачы напой маленечкімі глыткамі. Мужчыны курылі ў адчыненае на летні горад акно. Мужчыны гаварылі пра паэзію. Курыць тытунь, піць гарбату, разважаць пра вершы — тры правільныя дарослыя мужчынскія справы, якія добра робяцца ў нядзельны сонечны вечар. Так я думаў у дзяцінстве, стоячы ў нізкастольнай аднапакаёўцы паэта Дзяргая, дый цяпер так думаю.

### КРОЎ І АКВАРЭЛЬ

Кроў у нейкі момант робіцца падобнай да акварэлі. Кроў цячэ, і яна такая сакавіта-зыркая, яе кроплі густыя. Так і карціць нешта напісаць на адчайна-белай сурвэтцы. Ёсць мастачкі, што спакушаюцца відовішчам свежай крыві і малююць ды пішуць ёю. Нават выразы ўстойлівыя маюцца: «пісаць крывёю», «вершы, напісаныя крывёю», «запавет, запісаны крывёю», «дамова, падпісаная крывёю». Але ўсе яны малапраўдзівыя, фальшывыя, як рэкламныя слоганы. Кроў заварожвае сваім відовішчам, пакуль яна яшчэ цёплая ды жывая. Кроў не прыдатная для малявання і пісьма, бо яна вокамгненна мярцвее і губляе колер, бо яна робіцца падобнай да гліны, да зямлі, да тла. Каб напісаць кроў, варта ўзяць акварэль, хоць усе ведаюць, што «кроў не вада». Кроў — вадкі агонь.

### РАБАЎНІК І СТАРАЖЫТНЫ КІТАЙ

Калі табе сёння наканавана здымацца ў кіно, ты здымешся ў кіно, а не дасі вялікае інтэрв'ю ў газету ці на радыё. Здымкі планаваліся на вечар, яны і плануюцца на вечар, але здымацца я пачаў раніцай, без рэпетыцый і падрыхтоўкі. Я зайшоў у краму, каб выпіць кубачак кавы. Не стаў я загаворваць з будаўніком Юрыкам і не ўладкаваўся за столік да прадзюсаркі Ірусіка, я сеў за стол каля акна на праспект Незалежнасці. Я дачытваў прадмову да зборніка старажытнай кітайскай лірыкі, калі міліцыянты прывялі ў краму рабаўніка. Напрыканцы мінулага года ў Мінску адбылося гучнае злачынства з рабаваннем двух кіёскаў па абмене валюты і забойствам адной абменшчыцы. З майго месца быў выдатна відаць адзін з тых абрабаваных кіёскаў. Рабаўнік распавядаў на камеру пра сваё зладзейства і паказваў, што і як рабіў. А яшчэ рабаўнік паказваў на мяне, бо я сядзеў якраз на тым месцы, з якога ён доўгі час сачыў за абменнікам. Так я зняўся ў ролі мінскага рабаўніка. Роля мне не спадабалася. Калі ты чуеш пра злачынства з рабаваннем і забойствам, дык мімволі ўяўляеш забойцу вялікім і дужым чалавекам. А гэты быў худы, змэнчаны і нягоплены. Здавалася, ды я такога б голымі рукамі задушыў. Але здавалася тое нядоўга, бо ад злачынцы выпраменьвалася рэальная небяспека, і гэтае выпраменьванне не спынялі нават кайданы, якімі рука забойцы была прыкутая да рукі міліцыянта.

### СКАРЭННЕ І НАВУЧАННЕ

Вучыцца, ці не ў першую чаргу, гэта — скарацца і прымаць чужое меркаванне за сваё. Чым даўжэй жывеш, тым менее аўтарытэтаў, чые словы ты прымаеш з такой жа лёгкасцю, як прымаў словы маці і бацькі ў далёкім дзяцінстве.

### ШКЛЯНКА І МУЖНАСЦЬ

Шклянка гарэлкі дадае мужнасці. Тым, у каго скончаецца ці скончылася прыродная мужнасць, варта выкарыстаць шклянку гарэлкі. Ва ўсіх астатніх выпадках гарэлку трэба піць з чаркі, бо ў шклянцы гарэлка губляе чароўнасць.

### ВОВА І ЦВІК

Унук наступіў на цвік. Бегаў-лётаў вакол дома і наступіў на кавалак дошкі з іржавым цвіком. Добра, што днямі я разбіў сабе брыво над правым вокам — глыбока рассек дзвярыма, так глыбока, што давялося пайсці ў аптэку і набыць перакіс вадароду. Я папрасіў аптэкарку апрацаваць рану, а яна сказала, што ёй забаронена працаваць з крывёю. Правільная забарона! Каб ёй яшчэ забаранілі аблічваць кліентаў. А то яна думала, калі ў мяне кроў залівае твар, дык мяне можна абдурыць на пяць тысяч. Не выйшла. І я на аптэкарку моцна не сварыўся, бо яна мне дала сваё ўласнае павелічальнае люстэрка. Я заліў ранку перакісам. Тыдзень пазаліваў і думаў ужо выкінуць бутэлечку, а тут Вова наступіў на цвік, і перакіс прыдаўся. На дзецях раны хутка гояцца. Учора ён на цвік наляцеў, а сягоння разам з маці паехаў у Вільню. Вова з'ехаў, а ў мяне ўвачч у іржавы цвік тырчыць.

**Адам ГЛОБУС.**

## СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



## Сёння

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.33 | 20.56 | 15.23 |
| Віцебск — | 5.18 | 20.51 | 15.33 |
| Магілёў — | 5.23 | 20.46 | 15.23 |
| Гомель — | 5.26 | 20.37 | 15.11 |
| Гродна — | 5.49 | 21.11 | 15.22 |
| Брэст — | 5.56 | 21.06 | 15.10 |

**Месяц**

*Маладзік 10 жніўня. Месяц у сузор'і Рака.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Алімпіяды, Ганны, Іраіды, Аляксандра, Макара.*

***К.*** *Дароты, Клаўдзіі, Кандрата, Каятана, Сікста.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

# Вадалеі могуць павесяліцца ад душы, а Цяльцам лепш паводзіць сябе больш сціпла



**АВЕН.** Можаце здзейсніць амаль немагчымае, але варта задумацца, ці трэба гэта рабіць. Каб тыдзень меў пазітыўныя вынікі, усе важныя справы неабходна запланаваць на панядзелак і другую палову тыдня. У чацвер навакольныя будуць выказваць сімпатыю, дапамагаць і падтрымліваць вас. Субота — удалы дзень для разграбання назапашаных сямейных праблем.

**ЦЯЛЕЦ**. Адкіньце ўсе амбіцыі і паспрабуйце паводзіць сябе больш сціпла. Паспрабуйце ў першую чаргу зрабіць справы, важныя асабіста для вас, інакш можаце захапіцца вырашэннем чужых праблем. Праца, хутчэй за ўсё, будзе займаць шмат часу, але па значнасці яна будзе далёка не на першым месцы. Не забывайцеся пра свой дом: навядзенне парадку і стварэнне камфорту ў ім — таксама немалаважная задача.

**БЛІЗНЯТЫ**. Выдатны тыдзень для інтэлектуальнай працы, камандзіровак і вандраванняў. У панядзелак супрацьпаказаная паспешнасць, так што рабіце ўсё няспешна, калі хочаце пазбегнуць перанапружання і нервовых зрываў. У аўторак лепш устрымацца ад актыўнай дзейнасці, паспрабуйце быць выбіральнымі ў кантактах. Вашай злёгку запушчанай хатняй гаспадарцы патрэбна ўвага і абнаўленне. Выхадныя дні лепш прысвяціць свецкаму адпачынку або адпачынку за горадам.

**РАК**. Якім бы дзіўным гэта вам ні здавалася ў пачатку тыдня, рэалізаваць атрымаецца нават самыя неверагодныя планы. Пастаўцеся да справы, якую вам могуць даручыць у гэты дзень, з усёй адказнасцю. Ёсць шанц рэзка змяніць сітуацыю ў лепшы бок. У сераду і чацвер вас будзе адцягваць ад працы рамантычны настрой. Добры тыдзень для паходаў у кіно і тэатры, у госці да сяброў.

**ЛЕЎ**. Тыдзень спрыяльны для творчай актыўнасці. Час няўдач застаўся ззаду. Можна цешыцца і дзейнічаць — тым больш, калі вас перапаўняе творчая энергія. Пашырце свае гарызонты, навучыцеся чаму-небудзь новаму, востра неабходнаму. Калі вы яшчэ не знайшлі сваю пару, магчыма, гэты тыдзень выправіць сітуацыю. Выбраны вамі кірунак можа з лёгкасцю змяніцца на супрацьлеглы, так што сачыце за сабой.

**ДЗЕВА**. Тыдзень насычаны ўражаннямі і напоўнены падзеямі. Паспрабуйце выкарыстаць магчымую канфліктнасць для рэзкіх, але своечасовых і неабходных у гэты час дзеянняў. Зможаце справіцца амаль з усімі важнымі справамі — і нават з такімі, да якіх у вас ніяк не даходзілі рукі. Паспрабуйце дзейнічаць па загадзе пачуццяў, і ўсё ў вас атрымаецца. Вельмі ўдала пройдуць новыя сустрэчы.

**ШАЛІ**. Ва ўзоры вашага лёсу пераплятуцца дзве ніткі, адна з якіх — энергія завяршэння працэсаў, а другая — аднаўленне старых сувязяў або заняткаў. Гэты час спрыяльны для таго, каб развітацца з чымсьці аджылым, са шкоднымі звычкамі, дакучлівымі справамі і надакучлівымі людзьмі — і вызваліць месца для новых людзей або рэчаў. Але не перабярыце, чысцячы прастору вакол сябе: магчыма, нешта варта не выкідваць, а прывесці ў парадак, унесці змены ў ранейшыя адносіны, паглядзець на акалічнасці з новага пункту гледжання.

**СКАРПІЁН**. Ваша ўпартасць і ганарыстасць могуць зацягнуць сітуацыю на доўгі тэрмін або прывесці да непажаданых зменаў, нават стратаў. У наступным адчуванне гармоніі прыйдзе як вынік вырашэння праблем. Прызначаючы час для розных кантактаў і сустрэч, паспрабуйце ўлічыць, што вы можаце апынуцца па-за часам. Неспадзяваныя затрымкі і неймаверныя спазненні будуць здольныя панізіць ваш аўтарытэт, а тлумачэнні нічым не дапамогуць. У аўторак і сераду ўдалымі будуць паездкі, вандраванні і камандзіроўкі. У выхадныя займіцеся добраўпарадкаваннем дома ў чаканні гасцей.

**СТРАЛЕЦ**. Неабходна вызначыцца з кірункам прыкладання ўласных намаганняў. Наколькі гэта перспектыўна — пакажа будучыня, а цяпер важна засяродзіцца на абароне існуючых дасягненняў. Ёсць шанц атрымаць прапанову аб павышэнні па службе і наладзіць карысныя дзелавыя кантакты. Творчыя планы і задумы пачнуць паступова рэалізоўвацца. У панядзелак апынуцца плённымі перамовы з начальствам. Аўторак — выдатны дзень для ўвасаблення ў жыццё ўласных задум. А ў чацвер верагодны небывалы ўздым працаздольнасці. У гэты дзень зможаце паспець многае зрабіць — было б жаданне. У выхадныя пажаданы пасіўны адпачынак.

**КАЗЯРОГ**. Калі вы не трапляліся ў лапы да ляноты, то адказваць за недаробленую працу вам не давядзецца. Нагрузка на працы будзе паступова нарастаць. Толькі не ўзвальвайце на сябе ўсё адразу, выбірайце аб'ём працы па сілах. Паспрабуйце ў напружаным графіку выдаткаваць трохі часу для сябе, займіцеся самаразвіццём і самаўдасканаленнем. Прызнайце свае памылкі, але толькі не зацыклівайцеся на іх, а выпраўце і рухайцеся далей.

**ВАДАЛЕЙ**. Будзеце зачароўваць навакольных. Багацце кампліментаў можа нават закружыць вам галаву, але самае цікавае, што ўсе гэтыя прыемныя словы — праўда. Жаданні пачнуць выконвацца, так што, загадваючы іх, будзьце больш асцярожнымі. У аўторак не саромейцеся выкарыстаць сваё абаянне не толькі ў асабістых, але і ў дзелавых мэтах. У выхадныя дні рыхтуйцеся весяліцца так, быццам вам цалкам усё роўна, што будзе пасля. Таму што наступстваў не будзе.

**РЫБЫ**. Тыдзень абяцае быць яркім, калі не па выніку вашай дзейнасці, то, як мінімум, па эмацыйным напружанні. Цяпер самы час адкінуць дакучлівыя справы і адправіцца на пошукі новых уражанняў. Асабліва прыдатным для гэтага можа стаць панядзелак. У суботу пажадана праявіць абачлівасць. У гэты дзень небяспечна пасварыцца, бо потым будзе вельмі цяжка дасягнуць прымірэння.

## ДАГЛЯДЧЫЦУ МУЗЕЯ АСУДЗІЛІ

Два гады пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці — такі прыгавор вынес суд Полацкага раёна і Полацка ў дачыненні да былой даглядчыцы Полацкага музея-запаведніка. Высветлілася і было даказана, што 47-гадовая жанчына паўгода прысвойвала выручку ад рэалізацыі білетаў і сувенірнай прадукцыі па месцы працы. Агульная сума скрадзенага ёй склала больш за 15 мільёнаў рублёў. Буйны памер страты, прынесенай дзяржаўнай установе, безумоўна, паўплываў на вынясенне даволі суровага прысуду. Але справядлівага.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Фотаслова Яўгена Пясецкага

*Ізноў усіх*
*гартуе лёс*
*ў адной нястомнай плыні —*
*То ў люты*
*лютаўскі*
*мароз,*
*то ў пякельным*
*жніўні.*
*Гартуй, каваль,*
*але кажы:*
*навошта табе тое —*
*Звычайна вострыя нажы*
*гартуюць перад боем.*
*Што ў думках тоіцца*
*Тваіх —*
*кажы, магутны Божа,*
*Ў якім боі звядзеш усіх*
*і хто там пераможа?*



# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

КУЛІНАРНЫ НАТАТНІК

## Сакрэты смачнага кісялю

### 1. КРУХМАЛ

Галоўнае, што адрознівае кісель ад кампоту і морсу, — гэта яго гушчыня, якая дасягаецца дабаўленнем крухмалу — бульбянога або кукурузнага.

Ад колькасці крухмалу залежыць ступень гушчыні напою.

Сярэднія суадносіны: 2 сталовыя лыжкі бульбянога крухмалу на 4 шклянкі кісялю. 3 сталовыя лыжкі — гэта ўжо густы кісель, які ператвараецца з напою ў дэсерт.

### КІСЕЛЬ НА ДЭСЕРТ

Для падачы густога кісялю спатрэбяцца формачкі або разеткі, іх папярэдне трэба спаласнуць халоднай вадой. Затым кісель разліваюць па формах, а калі астыне — акуратна пераварочваюць формачкі на талерачкі і ўпрыгожваюць атрыманы дэсерт ягадамі, цукровай пудрай і ўзбітымі вяршкамі.

### 2. АСНОВА

Кісель атрымліваецца аднолькава смачным са свежых або замарожаных ягад. Часцей за ўсё яго вараць з вішняў, журавін, парэчак, клубніц. Для паскарэння працэсу варкі — замест «жывых» ягад выкарыстоўваюць фруктовыя сокі, сіропы і варэнне. Кісель можна рыхтаваць і на аснове сушаных пладоў (яблыкаў, курагі, шыпшыны, чарніц). Ну і, вядома, класіка жанру — малочны кісель.

### РЭЦЭПТ МАЛОЧНАГА КІСЯЛЮ

У каструлю ўліць 3 шклянкі малака, давесці да кіпення і ўсыпаць паўшклянкі цукру. 2 сталовыя лыжкі крухмалу развесці ў шклянцы халоднага малака, уліць у кіпячае малако і на слабым агні варыць кісель на працягу 5 хвілін, пастаянна памешваючы.

У гарачы кісель для водару можна дадаць ваніль, карыцу, цэдру лімона або любы сіроп. Астудзіце — і атрымлівайце асалоду!

### 3. ТЭХНАЛОГІЯ

Спачатку рыхтуецца сіроп: для гэтага 2 шклянкі вады даводзяць да кіпення, дадаюць 3/4 шклянкі цукру і разведзены ў шклянцы халоднай вады крухмал (2 сталовыя лыжкі). Памешваючы, даюць сіропу закіпець і выключаюць.

З ягад выціскаюць сок (або, праціраючы скрозь сіта, атрымліваюць пюрэ). Атрыманы сок уліваюць у гатовы сіроп і старанна перамешваюць. Кісель засталося толькі астудзіць.

### МАЛЕНЬКІЯ САКРЭТЫ

- Каб на паверхні не ўтварылася плёнка, кісель пасыпаюць цукрам або цукровай пудрай.
- Кісель не варта доўга кіпяціць, інакш ён стане вадкім.
- Разводзіць крухмал трэба падчас варкі сіропу, калі зрабіць гэта загадзя — ён асядзе на дно.

### ГАРБУЗОВЫ КІСЕЛЬ

Спатрэбіцца: гарбуз (мякаць) — 400 г, крухмал — 2 ч. лыжкі, малако (халоднае) — 1/3 шкл., малако — 1 л, цукар — на смак.



Мякаць гарбуза надзерці на дробнай тарцы, 2 чайныя лыжкі крухмалу размяшаць у 1/3 шклянкі халоднага малака, уліць струменьчыкам у 1 л кіпячага малака з цукрам. Памешваючы кіпяціць не даўжэй за 2 хвіліны, патроху дадаючы гарбузовую масу. Пастаянна мяшаючы, кіпяціць на слабым агні да загусцення.

Гарбуз не мае ўласнага, ярка выяўленага смаку, таму пры гатаванні гарбузовага кісялю лепш выкарыстаць нейкую садавінавую ад-душку, напрыклад 1-2 дробкі апельсінавай, ліМоннай або мандарынавай цэдры, надзёртай на дробнай тарцы, або 1 пачачак ванільнага цукру. Кісель атрымліваецца смачным і вельмі прыгожага бурштынава-жоўтага колеру.

-2676-

ЧЫСТЫ ДОМ

## Змагаемся з кніжным пылам

**Каб засцерагчы сябе і сваю сям'ю ад магчымай алергіі, вучымся пазбаўляцца ад кніжнага пылу.**

**За электроннымі кнігамі — будучыня, у сучаснасці ж — каштоўныя сямейныя бібліятэкі, якія збіраліся некалькімі пакаленнямі. Так, гэта візітная картка вашага дома, якая сведчыць пра інтэлект гаспадароў, аднак належнае ўражанне яна можа зрабіць толькі ў тым выпадку, калі кнігі не пакрытыя слоем пылу.**

### МЕДЫЦЫНСКАЯ ДАВЕДКА



Кніжны пыл — адзін з самых распаўсюджаных на сёння алергенаў (нараўне з хатнім кляшчом). Сімптомы алергіі нагадваюць ВРВІ або ВРЗ: катар, слёзацячэнне, пяршэнне ў горле. Таму ўрач можа памылкова прызначыць лекі ад прастудных захворванняў, якія не прынясуць палягчэння. Асаблівасць алергіі ў тым, што яе сімптомы могуць праявіцца адзін раз па незразумелых, здавалася б, прычынах, а могуць паўтарацца з года ў год. Самыя цяжкія формы гэтага захворвання — алергічная бранхіяльная астма, анафілактычны шок, алергічныя пашкоджанні стрававальнага тракта і іншых унутраных органаў.

Каб пазбегнуць падобных непрыемнасцяў, трэба ўтрымліваць кнігі ў чысціні. Лепш за ўсё, калі яны будуць захоўвацца ў зачыненай кніжнай шафе, за шклом. Але нават у гэтым выпадку кнігі і кніжныя паліцы трэба пыласосіць не радзей за два разы на год. Можна скарыстацца для гэтага і сухой чыстай анучай: акуратна зніміце ўсе кнігі з паліц, пратрыце шафу знутры і змахніце пыл з вокладкі і карэньчыка.

### ВОРАГІ КНІГ:

- прамыя сонечныя прамяні
- сырасць
- празмерна сухое паветра.

### ЯК ВЫДАЛІЦЬ ПЛЯМЫ?

- Чарнільныя плямы на вокладцы і старонках кніг выдаляюць з дапамогай перакісу вадароду.
- Плямы ад пальцаў злёгку націраюць мылам, затым праціраюць чыстай вільготнай анучкай. Старонку, якая выпадкова намокла, можна перасыпаць талькам, пасля чаго пакласці кнігу пад прэс да высыхання. Яшчэ адзін спосаб: змясціць мокрую старонку паміж двума белымі лістамі паперы і высушыць, прапрасаваўшы. Гэтым жа спосабам карыстаюцца, каб разгладзіць пакамечаную старонку (папярэдне яе трэба намачыць).
- Свежыя тлустыя плямы выдаляюць, прапрасаваўшы вокладку або старонку кнігі праз некалькі столак папяровых сурвэтак, змяняючы іх датуль, пакуль пляма не знікне.
- Старыя тлустыя плямы знікаюць, калі іх працерці мякішам свежага белага хлеба.
- Цвіль выдаляюць нашатырным спіртам.
- Сляды ад мух можна працерці воцатам.

САЛОН ПРЫГАЖОСЦІ

## Салодкі пілінг

Ачысціць і падцягнуць скуру, а заадно і даць ёй неабходныя вітаміны дапаможа мядовы пілінг.

Змяшайце 5 маленькіх лыжак мёду з 1 маленькай лыжачкай солі, сумесь накладзіце на твар і праз 10—15 хвілін змыйце вялікай колькасцю цёплай вады. Рабіце гэтую працэдуру не часцей за два разы на тыдзень.

-2677-

## 7 жніўня

Дзве даты

**1910 год** — нарадзіўся (в. Новы Пагост. сёння Міёрскі раён Віцебскай вобласці) Генадзь Іванавіч Цітовіч, вядомы беларускі этнамузыказнавец, харавы дырыжор, народны артыст Беларусі, народны артыст Савецкага Саюза. У 1939 годзе скончыў Віленскую кансерваторыю, вывучаў этнаграфію ў Віленскім універсітэце. Пасля вучобы арганізаваў і ўзначаліў аматарскі Падлескі народны хор у Ляхавіцкім раёне. З 1952 года — арганізатар і мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору (з 1988 г. носіць яго імя). Збіраў і вывучаў беларускі музычны фальклор. У розных раёнах Беларусі запісаў каля 3000 народных песень і танцаў. У навуковых работах даследаваў музычную творчасць славянскіх народаў, беларускае народнае шматгалоссе, народнае выканальніцтва, стылі сучаснай народнай песні. Аўтар песень на ўласныя словы і вершы беларускіх паэтаў, больш 60-ці апрацовак беларускіх народных мелодый («Рэчанька», «Жавароначкі, прыляціце», «Ой, рана на Івана» і інш.).



**1932 год** — у Савецкім Саюзе прыняты «закон аб трох каласках», які жорстка караў за крадзеж калгаснай маёмасці — ажно да смяротнага пакарання.

Цытата дня:

***«Калі вы хочаце, каб жыццё ўсміхалася вам, падарыце спачатку яму свой добры настрой».***

**Бенядыкт Спіноза (1632—1677), нідэрландскі філосаф.**

## АБРАД ЗАРУЧЫН

Свет і сусвет чалавека

**Найважнейшым складнікам шматдзённага вясельнага абраду быў рытуал заручын, у час якога аб'ядноўваліся рукі жаніха і нявесты. Пры гэтым жаніх дарыў нявесце пярсцёнак з жалеза, медзі, срэбра ці золата, у залежнасці ад свайго матэрыяльнага і сацыяльнага становішча.**

- У X—XI стст. народны абрад заручын стаў выконвацца ў храме з чытаннем адпаведных малітваў. Але яшчэ доўгі час, да XVI ст. — абрад заручынаў будзе выконвацца асобна ад абраду вянчання. Затым паступова яны супадуць па часе правядзення і стануць адзіным цэлым, захоўваючы былую паслядоўнасць: спачатку будуць праводзіцца заручыны, а потым вянчанне.

Царкоўныя крыніцы XIX — пачатку XX ст. даюць наступнае апісанне важнейшых вясельных рытуалаў: «Жаніх і нявеста па заканчэнні літургіі становяцца ў прытворы храма тварам да алтарнай часткі: жаніх з правага боку, нявеста — з левага... Пярсцёнкі, якімі яны будуць заручацца, у час літургіі знаходзяцца побач на правым баку святога прастолу: з левага боку — залаты, з правага — срэбны. Дыякан, ідучы за святаром, выносіць іх на спецыяльным падносе. Святар дае жаніху і нявесце свечкі... уводзіць іх усярэдзіну храма, дзе і адбудзецца заручэнне. Святар спачатку бярэ правы пярсцёнак, тройчы кажа: «Заручаецца раб Божы (імя) рабе Божай (імя)». Пры кожным паўторы гэтых слоў ён робіць хрэснае знаменне над галавой жаніха і надзявае яму пярсцёнак на безымянны палец правай рукі. Затым бярэ срэбны пярсцёнак і тройчы, з хрэсным знаменнем над галавой нявесты, кажа: «Заручаецца раба Божая (імя) рабу Божаму (імя)», — і надзявае ёй пярсцёнак таксама на безымянны палец правай рукі. Залаты пярсцёнак сімвалізуе сваім бляскам Сонца, на святло якога падобны муж у шлюбным саюзе; срэбнае — сімвал Месяца, які зіхціць адбіткамі сонечнага святла. Пярсцёнак — знак вечнасці і непарушнасці шлюбнага саюза.

- Пасля гэтага ў знак аддання сябе на ўсё жыццё адзін аднаму, а Госпаду — абодвух непадзельным адзінствам, у знак адзінадушша, згоды і ўзаемадапамогі ў будучым шлюбе жаніх і нявеста тройчы абменьваліся пярсцёнкамі пры дапамозе сябра жаніха ці святара. Пасля трохразовай перамены пярсцёнкаў, срэбны застанецца ў жаніха, а залаты — у нявесты ў знак таго, што жаночай слабасці перадаецца моцны мужчынскі дух.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнемся!

— Галя, зірні, якая там тэмпература на вуліцы?

— Звычайная, трыццаць шэсць і шэсць.

☺

**Учора чарговы раз пераканаўся, наколькі шкодна паліць.**

**Пайшоў на кухню скурыць цыгарэту, а там жонка суп пачала гатаваць.**

**Прыйшлося бульбу чысціць.**

☺

— Сямёнаўна, у краму жывых карпаў завезлі!

— Ну, значыць мой прама з ранку на рыбалку накіруецца.

☺

**Жаночы футбол — вельмі займальная гульня, але толькі ў дождж.**




ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказнага за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 3828. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12